# Гісторыя

*А.Б.БАГДАНОВІЧ*

## ДА ПЫТАННЯ АБ КАНФЕСІЙНЫМ КАМПАНЕНЦЕ Ў ВЫЗНАЧЭННІ ЭТНІЧНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ СЯРЭДНЕВЯКОЎЯ

Пытанне аб этнічнай самясвядомасці ўсходніх славян, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі ў сярэдневякоўі, з'яўляецца малавывучаным, больш таго, да нядаўнага часу яно "не мела статуса самастойнай навуковай праблемы"[1].

У эпоху сярэдневякоўя адным з важнейшых вызначаючых кампанентаў этнічнай самасвядомасці з'яўлялася канфесійная прыналежнасць. І невыпадкова такія буйныя вучоныя, як Д.С. Ліхачоў, С.А. Багуслаўскі, адзначалі, што цэнтральнай з'явай "Аповесці мінулых гадоў" з'яўляецца хрышчэнне Русі[2].

Так і старажытны летапісец лічыць, што менавіта гэтая з'ява вывела на гістарычную арэну новы народ – рускіх: "господь в вѣкы пребываясь, хвалим от руських сынов, неваем в тращи, а дѣмани проклинаем от благоверных муж и от верных жен, иже приняли суть хрещенье и понятье в отпущенье грехов новым людье хрестьянстии с избрании богом"[3].

Вядомы гісторык В. Ластоўскі заўважыў, што пераход у новую веру ("рускую") разглядаўся ў той час як адначасова і пераход у новую нацыянальнасць – рускую[4].

Аўтар "Аповесці мінулых гадоў" падкрэслівае "богавыбранне" рускага народа: "благословен господь Иисус Христос иже возлюби новыя люди, Русьскую землю и просвети ю хрещеньям святым"[5].

Прынцце хрысціянскай рэлігіі не толькі аб'яднала жыхароў Русі, яно ўводзіла ў сям'ю цывілізаваных еўрапейскіх народаў, далучала іх да старажытнай культуры. Візантыйская ж імперыя з'яўлялася да X ст. найбольш развітой краінай сярэдневяковай Еўропы, своеасаблівым культурным мастом паміж еўрапейскай поўначчу, азіяцкім усходам і афрыканскім поўднем. Адным з найважнейшых аспектаў распаўсюджвання хрысціянства з'яўляецца, па словах Ф.Энгельса, "тэалагічнае адзінства феадальнага грамадства. Язычніцтва ж сваімі мясцовымі культамі сур'ёзна затрымлівала працэсы кансалідацыі"[6].

Прынцце хрысціянства князем Уладзімірам звязана з хрышчэннем яго маці Вольгі. Гэта прэлюдыя да цэнтральнай з'явы летапіснага зводу. У артыкуле за 955 г. летапісец укладае ў вусны хрысціўшага княгіню Вольгу патрыярха наступныя словы: "Благословенна ты в женах русских, яко возлюби свет, а тьму остави; благослови тя хотять сынове растии и в последний род внук твоих"[7]. Летапісец, такім чынам, звязвае зямлю Рускую з рускімі жонкамі і сынамі, г.зн. з усім народам рускім.

У трактаце Канстанціна Багранароднага "Тлумачэнні царскага чыну" дэталёва апісаны прыём, учынёны візантыйскім імператарам у сувязі з прыездам Вольгі ў Канстанцінопаль. У трактаце Вольга названа княгіняй рускай[8].

Уладзімір, хрысціўшыся ў 988 г., "повеле кумиры испровреeци, авы исьмии, а другие огневи предати"[9].

Першым кіеўскім мітрапалітам быў Леон ці Леў, прысланы з Канстанцінопаля ў 991 г. На жаль, "Аповесць мінулых гадоў" нічога не гаворыць аб

першым уладыку. Назначэнне мітрапаліта з'явілася немалым поспехам Уладзіміра, таму што падымала міжнародны прэстыж Рускай зямлі. Наогул Уладзімірам было створана восем епархій. У буйнейшыя гарады Русі накіроўваліся епіскапы. Адным з найважнейшых гарадоў Русі ў той час лічыўся Полацк. Таму хрышчэнне полацкага краю адносіцца да часоў Уладзіміра, пры ім жа была адкрыта ў Полацку і епархія; у гэты ж час ствараецца епархія і ў Тураве. Епіскапы полацкія і тураўскія назначаліся Кіеўскім мітрапалітам.

Яраслаў Мудры дабіваўся ўмацавання рускай мітраполіі, пашырэння яе правоў. Для гэтага патрэбен быў мітрапаліт з усходніх славян і кананізацыя славянскіх святых. Першую задачу ў 1051 г. вырашыў сабор епіскапаў, які абраў мітрапалітам Іларыёна.

Веліч княжаскай палітыкі была падмацавана буйным будаўніцтвам. Так, у Кіеве "заложи Ярослав город великий, у него же града суть Златая врата; заложи же и церковь святыя Софья ... церковь на Златых вратах святыя Богородицы и благовещенье, святого Георгия монастырь и святыя Ирины"[10].

Пабудаваны ў Кіеве ў 1037–1057 гг. Сафійскі сабор сімвалізаваў веліч Рускай дзяржавы. У той жа час будуюцца аналагічныя кіеўскаму сабору цэрквы Святой Сафіі ў Ноўгарадзе (1045–1052) і Полацку. Так, паміж 1044–1066 гг. пабудаваны першы на Беларусі мураваны храм – полацкі Сафійскі сабор. Пад уплывам старажытнарускай, візантыйскай і заходнееўрапейскай архітэктуры скл аліся полацкая і гродзенская школы дойлідства. Гісторыя захавала імёны дойлідаў: полацкага Іаана і гродзенскага Пятра Міланега. Гэты тып архітэктуры характэрны і для Вялікага сабора Бельчыцкага манастыра пад Полацкам, узведзенага ў першай палове XII ст.

Вялікае значэнне для фарміравання самасвядомасці беларусаў мела пропаведзь першага рускага мітрапаліта Іларыёна "О законе, Моисеом данным ему, и о благодати". Пропаведзь Іларыёна прасякнута патрыятычнымі матывамі, яна праслаўляе князя Уладзіміра за тое, што ён увёў хрысціянства, Ігара і Святаслава – за мужнасць і перамогі над ворагамі.

Іларыён стварыў сапраўдны гімн Радзіме, адзначыўшы, што рускія князі правілі "не в худе бо и в неведоме земли владычъствовавша, но в Русской, яже ведома и слышима есть всеми концы землѣ..."[11]

Цікавай крыніцай па вывучэнню этнічнай самасвядомасці з'яўляецца найстаражытны заканадаўчы помнік старажытнарускай дзяржавы – "Правда руськая". Акадэмік Я.Ф.Карскі правёў вялікую працу па падрыхтоўцы "Правды" да выдання; ён паведаў аб дзеянні дадзенага заканадаўства на тэрыторыі Беларусі[12]. Праваслаўнае духавенства сачыла за захаваннем норм "Правды руськой". Калі ўсходнія славяне прынялі хрысціянства, то злачынствамі аказаліся многія справы, якія дагэтуль такімі не лічыліся, гэта: мнагажэнства, бракі ў блізкай ступені роднасці, усе віды чараўніцтва. Наогул, шлюбу ў старажытнасці надавалася важнае значэнне. Нормы звычаёвага права цесна перапляталіся з рэлігійнымі вераваннямі і дагматамі царквы, а прадстаўнікі духавенства актыўна ўдзельнічалі ў разглядзе судовых спраў.

В.О.Ключэўскі адзначаў, што "Правда руськая" увогуле дзейнічала ў сферы царкоўнага суда, у сферы царкоўнай юрыспрудэнцыі[13]. Д.С.Ліхачоў лічыць, што ў абавязкі духавенства хрышчонай краіны ўваходзіла азнаёміць народ у першую чаргу з нормамі права, а ужо потым з культурай[14]. Такім чынам, "Правда руськая" распаўсюджвала сваё дзеянне на ўсходнеславянскае насельніцтва Беларусі.

Паэтычны стыль выдатнага царкоўнага дзеяча, пісьменніка і прамоўцы, епіскапа Кірылы Тураўскага блізкі да "Слова об палку Ігаравым"; яго прамовы ўяўляюць сабой узоры царкоўнага красамоўства. Нездарма сучаснікі прызвалі яго Златавустам.

Пасля смерці К.Тураўскага ў канцы XII ст. невядомым аўтарам было напісана "Жытие святога нашага айца Кирылы, епископа Тураўскага". У жыціі гаворыцца, што "блажынны Кірыла нарадзіўся і ўзгадаваўся ў рускім горадзе Тураве". Падкрэсліваюцца яго заслугі перад роднай зямлёй:

"прыйдзіце ж сёння браты ўсхваліть сваяго свяціцеля такімі словамі: "Радуйся святару, шаноўны настаўніча, наш другі Залатавуст, што праззяў больш за ўсіх на Русі! Радуйся свяціцелю, бо найсвятлейшым вучэннем сваім асвятліў землі рускія"[15].

Вельмі важна ў вывучэнні этнічнай самасвядомасці выхадцаў з Беларусі з'яўляецца разгляд "паломніцкай літаратуры", напісанай нашымі землякамі пасля наведвання імі "святой зямлі", іх успамінаў аб наведванні цэнтраў праваслаўя – Канстанцінопаля і Афона. Менавіта ж далёка ад Радзімы чалавек найбольш дакладна вызначаў сваю этнічную прыналежнасць.

Цікавым помнікам паломніцкай літаратуры з'яўляецца "Житие и хождение Данила, руския зямли игумена". Ігумен Даніла здейсніў у 1106–1107 гг. вандраванне ў Палесціну. Прайшлі стагоддзі, але як дакладна адлюстраваў старажытнарускі вандроўнік стан чалавека, які выехаў за мяжу без спадарожнікаў-сяброў, не ведаючы замежнай мовы! У "святой зямлі" Даніла лічыць сябе прадстаўніком ад "руськия землѣ"[16]. У сваёй малітве ў Іерусаліме ён называе імёны князёў Глеба Усеславіча Мінскага, Давыда Усеславіча і Барыса Усеславіча, сыноў полацкага князя Усеслава Чарадзея: "А яко во всех мѣстах святых не забыть имён князь руских и княгинь, и детей их, и епископ и иегумен и боляр и дѣтей моих духовных и всѣхь христиан николи же не забыл есьм; но во всех святых местах поминал"[17].

Патрэбна адмеціць, што паколькі "Руськая зямля" з'яўлялася цэнтрам мітраполіі, а хрысціянства распаўсюдзілася на ёй дастаткова рана і шырока, то і пануючую праваслаўную канфесію сталі называць "рускай", звязваючы яе з "рускай зямлёй" у вузкім сэнсе. У працэсе распаўсюджвання праваслаўя сярод славян-язычнікаў яго прыхільнікі пачалі звацца "рускімі", што атаясамлівалася з паняццем "хрысціянін".

Як падкрэслівае даследчык Э.Зайкоўскі, у той час сама назва "рускі" была перш за ўсё канфесіонімам[18]. Знікненне назваў "крывічоў", "дрыгавічоў", "радзімічаў" звязана як з працэсамі рэгіянальнай этнакансалідацыі, так і з прыняццем "рускай веры". Паколькі ў сярэдневякоўі дамінуючай была не нацыянальная самасвядомасць, а канфесіянальная, то і ў свядомасці прадстаўнікоў феадальнага саслоўя тэрмін "Русь" пачаў паступова азначаць частку тэрыторыі Усходняй Еўропы, на якой жылі праваслаўныя, і іх пачалі лічыць "рускімі". Свецкая разнастайнасць царкоўнаславянскай мовы, якая часткова ўспрыняла мясцовыя асаблівасці, пачала называцца "русским языком".

Уваходжанне беларускіх зямель у Вялікае княства Літоўскае першапачаткова не прывяло да змяненняў у этнічнай самасвядомасці славянскай часткі жыхароў дзяржавы. Вялікія князі літоўскія ў адносінах да ўсходнеславянскага насельніцтва доўга прытрымліваліся прынцыпа "старины не рухати", згодна з якім практычна ўсе ўзаемаадносіны і прававыя нормы папярэдняга часу не толькі захоўваліся, але і выконваліся. Усходнеславянскае насельніцтва Беларусі атрымала ў спадчыну не толькі "рускае права", размоўную мову, мову летапісаў, але і этнічнаю самасвядомасць. Калі ж у 1386 г. Вялікі князь Уладзіслаў-Ягайла, пасля жаніцьбы на польскай каралеве Ядвізе, быў абраны каралём Польшчы і прыняў каталіцтва, прымусова мянялася і этнічная самасвядомасць насельніцтва.

Вядома, што Вялікае княства Літоўскае было дзяржавай шматканфесійнай. Язычніцтва з'яўлялася натуральным становішчам для аўкштайтаў і жэмайтаў. Так, Аўкштайтыя заставалася язычніцкай да 1387 г., Жэмайція – да 1414, а схіленне ў новую веру не заўсёды было добраахвотным.

Нашы продкі актыўна гандлявалі з суседзямі; славянам, што пасяліліся ў Рызе, ужо ў XIII ст. даваліся грамадзянскія правы. У Рызе нават быў так званы "русский конец", там знаходзіліся лаўкі купцоў, а ў прадмесці горада знаходзілася "руская вёска". Большасць пасяленцаў былі з Полацка і прыдвінскіх абласцей.

Разгледзім два дакументы: гандлёвы дагавор Полацка з Рыгай і вялікакняжацкую грамату 1480 г. Гандлёвы дагавор быў заключаны ў 1406 г. У ім адзначаецца: "полочане и рижане должны друг друга защищать, оберегать и

оборонять, как себя самих в своих городах. А если русский купец провинится в Риге, его нужно отправить в Полоцк и судить по праву"[19]. А ў вялікакняжацкай грамаце пішацца: "нам блюсти Псковитина как и Литвина, а вам Литвина нашего блюсти как и Псковитина"[20]. Чаму фактычна аднолькавыя па сэнсу дакументы маюць розную этнанімічную афарбоўку? Ды таму, што жыхары Полацка ў большасці з'яўляліся праваслаўнымі і іх этнонім – русіны, рускія, як ужо адзначалася, быў звычайным.

І нарэшце назіраўся канфесійны прэсінг супраць праваслаўных жыхароў Вялікага княства з боку Віленскага епіскапства, заснаванага прывілеем Ягайлы ад 17 лютага 1387 г. Яно ўключала фактычна ўсю тэрыторыю Беларусі, манаскія ордэны францысканцаў, бернардзінцаў і аўгусцінцаў. Антыправаслаўнай была і вялікакняжацкая джяржаўная палітыка. У 1481 г. была прынята пастанова аб забароне будаўніцтва праваслаўных храмаў на тэрыторыі Вялікага княства. Не прызнаваліся і перадачы земляў праваслаўнай царкве і манастырам у якасці падарункаў і завяшчанняў.

Няпростае становішча праваслаўнага насельніцтва Вялікага княства адлюстроўваюць адпіскі пад'ячага Ф. Шэстова намесніку г. Вязьмы князю Турэню-Абаленскаму, састаўленыя ў 1498 г. Вось невялікая вытрымка з гэтых адпісак: "... все наше православное христианство хотят окстити ино нашу Русь... Литвою не любят"[21].

Зразумела, праваслаўныя жыхары Вялікага княства не маглі змірыцца з каталіцкім гвалтам. Выразнікам гэтага незадавальнення стаў брат Ягайлы, Свідрыгайла Альгердавіч, пасля смерці Вітаўта ў 1430 г. – Вялікі князь. У адной з пісьмовых крыніц XV ст. Свідрыгайлу называюць "Великий князь Швидригал Руский"[22].

. Нашы продкі працягвалі лічыць сябе "русінамі", "русью", "рускімі". Але паступова рос міжнародны аўтарытэт Вялікага княства і ў дзяржаўна-палітычным кантэксце любы жыхар дзяржавы мог называць сябе "ліцвінам".

Першыя ўпамінанні аб Белай Русі адносяцца да XIV ст., але вялікая дыстанцыя паміж спарадычнымі назвамі тэрыторый і самасвядомасцю народа, які жыве на ёй.

Вядома, што хаця праваслаўная царква ў ВкЛ паступова страчвала свае грамадска-палітычныя пазіцыі, але яна засталася асноўнай захавальніцай усходнеславянскіх традыцый у галіне культуры. Крыніцы даюць падставу гаварыць аб магутным культурным уплыве Русі на Літву, якая па складу насельніцтва і асаблівасцям жыцця ўяўляла сабой больш рускае, чым літоўскае княства.

Выдадзены ў 1447 г. Вялікім князем Казімірам агульназемскі прывілей гарантаваў праваслаўным феадалам ВкЛ эканамічныя і палітычныя правы нароўні з феадаламі-католікамі. Але на практыцы доступу да вышэйшых дзяржаўных пасад феадалам-некатолікам не было. Гэта вяло да акаталічвання беларускай шляхты і ў выніку збліжала феадалаў розных нацыянальнасцей на базе адной сацыяльнай платформы і прыводзіла да ўзмацнення такога кампанента, як дзяржаўны патрыятызм.

Разгледзім дагаворную грамату Вялікага князя Казіміра Ягелонавіча са Псковам; грамата датуецца 1440 г.: "или Лях, или Русин, или Полочанин, или Витебчанин, или Смолянин... тороговати во Пскове без пакости. Також и псковичам... путь чист в Литовскую землю, а торговати во всей Литовской земле без пакости"[23].

Градацыя насельніцтва Вялікага княства па канфесійнай прымеце прасочваецца нават у тытуле Жыкгімонта: "Жыкгимонт, Божю милостю корол полскии, великии князь литовский, рускии и иных многих земель господарь."[24] Рускімі землямі называлі тэрыторыю, занятую ў асноўным праваслаўным насельніцтвам. Назва захоўвалася вельмі доўга. Да першай паловы XVI ст. большая частка насельніцтва Беларусі ўваходзіла ў склад аўтакефальнай праваслаўнай мітраполіі на чале з мітрапалітам Кіеўскім і ўсёй Русі.

Колькасць праваслаўных цэркваў мітраполіі ў XVI ст. (яна ахоплівала землі Беларусі, Украіны, частку Літвы і Польшчы) дасягала некалькіх тысяч.

Афіцыйна мітрапаліта прызначаў Канстанцінопальскі патрыярх. Але фактычна заходнерускіх мітрапалітаў выбіраў Вялікі князь, які разлічваў на лаяльнасць святароў да яго палітыкі. Нелаяльны мітрапаліт аказваўся ў складаным становішчы: Вялікі князь мог нават выгнаць яго, апраўдваючыся, напрыклад, наступным чынам: "не хотячи оскудения видети митрополии Киевской и сладав с нашею братьею, с князями Русскими наших Русских земель того Фотья изгнали"[25]. Цікавая таксама спасылка Вітаўта на неабходнасць параіцца з праваслаўнымі феадаламі Вялікага княства, г.зн. "князьями русскими"[26].

Брэсцкая ўнія 1596 г. аб'яднала праваслаўную і каталіцкую цэрквы. Вось як характэрызуе гэту падзею летапіс: "кагды ж тот зъезд только народу рускому зложон, дознавши его быть и тых владыков отщепенцами, оных за пастыров не мети"[27]. Люблінская і Брэсцкая ўнія садзейнічалі акаталічванню і паланізацыі праваслаўнага насельніцтва Вялікага княства Літоўскага.

[1] Чаквин И.В., Терешкович П.В. // Советская этнография. 1990. №6. С.42.
[2] Лихачев Д.С. Национальное самосознание Древней Руси. М., 1947. С.23.
[3] Повесть временных лет. М.; Л., 1950. Ч.1. С.82. (У далейшым – ПВЛ).
[4] Ластовский В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Коўно, 1926. С.7.
[5] ПВЛ. С.82.
[6] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т.21. С.495.
[7] ПВЛ. С.44..
[8] Константин Богрянородный // Изв. гос. академии истории материальной культуры. Вып.91. М.; Л., 1934. С.47.
[9] ПВЛ. С.47.
[10] Там жа. С.102.
[11] Хрестоматия по древней русской литературе. М., 1955. С.32.
[12] Правда русская: Тексты. М.; Л., 1940. Т.2. С.515.
[13] Ключевский В.О. Соч. в 9 т. М., 1987. Т.1. С.219, 222; Он же. Специальные курсы. М., 1989. Т.7. С.85.
[14] Лихачев Д.С. Национальное самосознание Древней Руси. С.12.
[15] Памяць Святога нашага бацькі Кірылы, епіскапа Тураўскага // Спадчына. №2. С.33.
[16] Православный палестинский сборник. СПб., 1885. Т.3. Вып.3(9). С.128.
[17] Там жа. С.140.
[18] Зайкоўскі Э. Беларусіка. Кн.2. Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. Маладзечна, 1992. С.264–265.
[19] Полоцкие грамоты. М., 1977. Вып.1. С.105.
[20] Там жа. С.93.
[21] Там жа. С.32.
[22] Акты Западной России. СПб., 1846. Т.1. С.50..
[23] Там жа. С.51.
[24] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф.КМФ-18, воп.1, спр.8, арк.28.
[25] Акты Западной России. СПб., 1846. Т.1. С.36–37.
[26] Там жа.
[27] Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. Мн., 1978. С.126.

*Н.А.ГЛУШАКОВА*

## ПРАБЛЕМА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎЛАДКАВАННЯ БЕЛАРУСІ Ў ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ЭСЭРАЎ (снежань 1918–ліпень 1920 гг.)

Распад Расійскай імперыі пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. прыметна актывізаваў беларускі грамадска-палітычны рух. Нацыянальная ідэя авалодала свядомасцю многіх беларусаў-вайскоўцаў, сялян, рабочых, бежанцаў. Носьбітам гэтай ідэі стала нацыянальная інтэлігенцыя, аб'яднаная ў палітычных партыях і грамадскіх арганізацыях. Беларускі народ апынуўся перад праблемай выбару свайго нацыянальна-дзяржаўнага ідэалу. Пры гэтым пошук форм будучага дзяржаўнага ўладкавання края характарызаваўся супрацьборствам розных палітычных сіл, што змагаліся за ўладу. Кожная плынь грамадска-палітычнага руху па-свойму разумела мэты і шляхі рэалізацыі права беларускага народа на самавызначэнне, сацыяльныя і эканамічныя асновы будучай дзяржавы.

Сваю канцэпцыю нацыянальнага адраджэння Беларусі распрацавала і партыя беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў, што ўзнікла ў красавіку 1918 г. у выніку расколу Беларускай Сацыялістычнай Грамады. У яе аснову была